# КАТЫ АКТЫЎНІЧАЮЦЬ, нібыта на пачатку вясны

## Насамрэч таму, што яны сакавіцкія. І на мастацкай выставе

Колькі ні малюй катоў, яны ніколі не будуць падобныя адзін на аднаго. Сапраўды, нібыта людзі. І палашчыць іх хочацца, таму што здаецца, што вось зараз яны саскочаць з карцін у залу, ці ажывуць дзіўнаватыя каціныя скульптуры, каб даказаць: у гэтым свеце магчыма ўсё і не трэба шмат фантазіі, каб некаму даць надзею на жыццё. Дзеля гэтага і задумваўся мастацкі праект «Сакавіцкія каты» — міжнародныя дабрачынныя выставы арганізоўваюцца ў падтрымку хворых дзяцей.

— «Сакавіцкія каты» — традыцыйная выстава, з яе пачынаецца вясна. А вясна — гэта сімвал надзеі, — падкрэсліла Ала Нароўская, куратар выставы.

Вясна, якую хацелі падштурхнуць добрымі справамі мастакі, сёлета адкладвалася, было невядома, у якой зале можна будзе паглядзець выставу. І ў красавіку дзверы для яе адчыніла галерэя «Універсітэт культуры». Сёлета ў шостай Міжнароднай дабрачыннай выставе бяруць удзел 126 мастакоў з 6 краін свету — Беларусі, Літвы, Польшчы, Сербіі, Расіі, ЗША.



Арганізатары з Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Майстар», паводле слоў яго кіраўніка Сяргея Крыштаповіча, збіраюцца правесці аўкцыён, каб сабраць сродкі ў падтрымку праграмы «Дзіцячае сэрца». Прадаваць ёсць што: на выставе дэманструецца каля 400 твораў жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Ужо ў маі інтэрнацыянальная брыгада кардыяхірургаў будзе праводзіць аперацыі цяжкахворым дзецям з парокамі сэрца. Сродкі ад аўкцыёна будуць накіраваныя на постаперацыйную рэабілітацыю малых, якія растуць у малазабяспечаных сем'ях. Карыне Малафей з Баранавіцкага раёна пакуль толькі тры месяцы, Кірылу Кляпацкаму з Полацка — адзін годзік, Валянціне Аўсяннікавай з Жодзіна — тры гады. Гэта сапраўды вясна надзеі для іх бацькоў.

**Вольга ГРЫКІНА.**





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ